ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Свіслацкая раённая бібліятэка»

С.I.Піваварчык

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення раённага бібліятэчнага конкурсу
"Любы сэрцу куточак Радзімы"

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Інструкцыя вызначае парадак і ўмовы правядзення раённага бібліятэчнага конкурсу "Любы сэрцу куточак Радзімы" (далей – Конкурс) на лепшую арганізацыю краязнаўчай работы сярод бібліятэк.

1.2 Конкурс накіраваны на ўдасканаленне работы па адраджэнні і захаванні гістарычнай памяці Свіслаччыны, найбольш поўнае і якаснае накапленне краязнаўчых рэсурсаў у бібліятэках, іх рацыянальнае выкарыстанне для задавальнення інфармацыйных патрэб насельніцтва, выхаванне ў падрастаючага пакалення адказнасці за зберажэнне культурнай і гістарычнай спадчыны.

1.3 Арганізатарам Конкурсу з'яўляецца дзяржаўная ўстанова культуры "Свіслацкая раённая бібліятэка".

1.4 Конкурс разлічаны на перыяд з 01.01.2019 па 31.12.2020гг.

II. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1 Актывізацыя работы бібліятэк па арганізацыі краязнаўчай дзейнасці.

2.2 Павышэнне сацыяльнай значымасці бібліятэк, як цэнтраў краязнаўчай інфармацыі.

2.3 Удасканаленне арганізацыі краязнаўчых фондаў, стварэнне і падрыхтоўка ўласных краязнаўчых матэрыялаў, актыўнае іх выкарыстанне з дапамогай шырокага спектру формаў і метадаў бібліятэчнай дзейнасці.

2.4 Афармленне выстаў народнай творчасці і папулярызацыя работ мясцовых умельцаў, складанне летапісаў населеных пунктаў, афармленне альбомаў, стэндаў, вядзенне тэматычных папак.

2.5 Распаўсюджванне інфармацыі аб краязнаўчых і мясцовых дакументах, краязнаўчых ведаў сярод насельніцтва, а таксама рэкламаванне краязнаўчых збораў і інфармацыйных магчымасцей бібліятэк.

2.6 Фарміраванне ў чытачоў вызначанай сістэмы ведаў аб краязнаўстве, устойлівага захаплення краязнаўчай літаратурай. Прыцягненне ўвагі падрастаючага пакалення да вывучэння гісторыі роднага краю,

фарміраванне грамадзянска-патрыятычных адносін да Радзімы праз арганізацыю рознапланавых мерапрыемстваў.

2.7 Выяўленне, вывучэнне і ўкараненне бібліятэчных інавацый у краязнаўчым накірунку.

2.8 Развіццё творчага патэнцыялу бібліятэкараў.

## III. ЗМЕСТ, АРГАНІЗАЦЫЯ, УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ

3.1 Рэалізацыя конкурсу ажыццяўляецца па наступных напрамках:

*Гістарычнае краязнаўства*

•збор матэрыялаў аб гісторыі Свіслацкага краю;
•запіс легенд і ўспамінаў пра край і яго жыхароў;
•афармленне выставы-экспазіцыі.

*Літаратурнае краязнаўства*

•вывучэнне тапанімікі;
•запіс народных прыпевак, песень, прымавак, абрадаў;
•вывучэнне літаратурнай творчасці ўраджэнцаў і жыхароў Свіслаччыны.

*Людзі роднага краю*

•работа па выяўленню вядомых людзей краю, збор інфармацыі аб іх жыцці;
•работа па выяўленню цікавых і таленавітых людзей;
•сканіраванне фатаграфій з сямейных архіваў, афармленне экспазіцыі “Сямейны фотаальбом”, складанне радаводаў.

*Прамысловасць і сацыяльны комплекс краю*

•збор інфармацыі аб гісторыі прамысловых і сацыяльных аб’ектаў;
•правядзенне сустрэч з калектывамі прамысловых і сацыяльных аб’ектаў.

3.2 Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

- масавае мерапрыемства па папулярызацыі ведаў і фарміравання цікавасці да гісторыі роднага краю;
- медыяпрэзентацыя, прысвечаная памятным мясцінам Свіслаччыны;
- арганізацыя выставачнай дзейнасці па краязнаўству (фотавыстава, інфармацыйная выстава, выстава-экспазіцыя, выстава-партрэт і інш.);
- інфармацыйна-краязнаўчы прадукт (на папяровым ці электронным варыянтах);
- бібліяграфічная работа па раскрыццю і вывучэнню гісторыка-культурнай спадчыны краю.

3.3 Конкурсныя матэрыялы павінны ўключаць:

- інфармацыю аб краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі за 2019г., 2020г.;
- уласныя друкаваныя і электронныя выданні (буклеты, сцэнарыі мерапрыемстваў, летапісы населенных пунктаў, запісы ўспамінаў, макеты выставак, медыяпрэзентацыі і інш.);
- публікацыі ў СМІ краязнаўчага характару.

## IV. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ

4.1 Ацэнку конкурсных работ ажыццяўляе журы Конкурсу.

4.2 Журы вызначае пераможцаў Конкурсу галасаваннем і ацэньвае работу па наступных крытэрыях:

- інфарматыўнасць, паўната раскрыцця тэмы;

- арыгінальнасць зместу і формы работы;
- творчы падыход да стварэння ўласнага рэсурсу.

## V. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

5.1 Падвядзенне вынікаў адбудзецца ў два этапы: у студзені 2020 года (па выніках работы за 2019 год), студзені 2021года (па выніках работы за 2020 год).

5.2. Вынікі ацэнкі работ удзельнікаў вызначаюцца па зводных выніках колькасці балаў, прысвоеных кожным членам журы.

5.3. Па колькасці набраных балаў вызначаюцца пераможцы Конкурсу, якія занялі I, II і III месцы.

5.4. Вопыт і інавацыі, выяўленыя ў ходзе Конкурсу, будуць абагульнены падчас круглага стала, дзе адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў. Лепшы вопыт работы будзе размешчаны на сайце дзяржаўнай установы культуры “Свіслацкая раённая бібліятэка” і ў СМІ.